**25.** Правобразам героя аканома Жэготы ў паэме Адама Міцкевіча “Дзяды” стаў вядомы беларускі дзеяч …

**А)** В. Ф. Дамброўскі. **Б)** І. І. Дамейка. **В)** У. М. Дабравольскі.
**Г)** М. В. Доўнар-Запольскі. **Д)** У. М. Ігнатоўскі.

**26.** Выпадак, які меў месца ў мінулым і служыць прыкладам або апраўданнем для аналагічных выпадкаў у будучым называецца …

**А)** прэцыдэнт. **Б)** прыцэдэнт. **В)** прэцэдэнт.
**Г)** прыцыдэнт. **Д)** працэдэнт.

**27.** Хто з беларускіх мастакоў слова быў удзельнікам гістарычных падзей пачатку XX стагоддзя: Лютаўскай рэвалюцыі і штурму Зімняга палаца ў 1917 годзе, Грамадзянскай вайны?

**А)** Алесь Гарун. **Б)** Алесь Гурло. **В)** Платон Галавач.
**Г)** Кандрат Крапіва. **Д)** Андрэй Мрый.

**28.** Выберыце з дадзеных прыкладаў правільна напісаныя словы:

*1) кінастужка; 2) клеявар; 3) сямібор’е;*
*4) скараварка; 5) сталеліцейны.*

**А)** усе прыклады. **Б)** усе прыклады, акрамя 2.
**В)** 1, 2, 4. **Г)** 2, 3, 5. **Д)** 3, 4.

**29.** Старажытны паэт Луцылій (II ст. да н. э.) пісаў вершы, карыстаючыся змешанай літаратурнай формай. Такія вершы называліся ў той час …

**А)** замалёўкамі. **Б)** сатырамі. **В)** складамі.
**Г)** напевамі. **Д)** гісторыямі.

**30.** Хто з выдатных беларускіх даследчыкаў фальклору сказаў: *“Вышэй за ўсё – умець падслухаць біццё сэрца народа, умець адкрыць іерогліфы легенд ключом уласнай шчаслівай інтуіцыі, умець узнавіць вобразы мінулага ў барвах і контурах.”*

**А)** Я. Баршчэўскі. **Б)** А. Сержпутоўскі. **В)** Ул. Сыракомля.
**Г)** П. Шпілеўскі. **Д)** Е. Раманаў.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3–218
тэл. (017) 292 80 31, 292 34 01, 290 01 53
e-mail: info@bakonkurs.by
http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 12. Тыраж 19900 экз. г. Мінск. 2010 г.

# Конкурс па беларускай мове
# «БУСЛІК-2010»

*Чацвер, 18 лютага 2010 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку.

## Заданне для вучняў 9-10 класаў

**1.** Вызначце, якая з дадзеных літар у радзе лішняя: ***а, о, ў, ы.***

**А)** няма лішняй літары. **Б)** а. **В)** о. **Г)** ў. **Д)** ы.

**2.** Як перакладаецца на беларускую мову рускае слова ***валежник***?

**А)** ельнік. **Б)** мох. **В)** бярлога. **Г)** ламачча. **Д)** дупло.

**3.** Вызначце, у якім з прыведзеных словазлучэнняў няправільна ўжыты зваротны займеннік ***сябе***: *1) паклікаць да сябе; 2) сказаць самому сабе; 3) дараваць сябе; 4) трымаць пры сабе.*

**А)** ва ўсіх словазлучэннях займеннік напісаны правільна.
**Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**4.** Колькі назоўнікаў адзіночнага ліку ўжыта ў вершаваных радках М. Пазнякова:

*Заўсёды будзь*
*Руплівым, шчырым.*
*Кроч да людзей*
*З дабром*
*І мірам.*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**5.** Вызначце від сказа: *У самы раз была гэтая цеплыня: у лесе стаяў густы халодны туман, у расе былі травы, кусты і дрэвы.*

**А)** просты сказ. **Б)** складаназлучаны сказ. **В)** складаназалежны сказ.
**Г)** бяззлучнікавы сказ. **Д)** складаны сказ з рознымі відамі сувязі.

**6.** Выберыце з прыведзеных назоўнікі мужчынскага роду:

*1) шынель; 2) накіп; 3) пыл; 4) цень; 5) стэп.*

**А)** няма такіх назоўнікаў. **Б)** усе назоўнікі. **В)** 1, 4. **Г)** 2, 3, 5. **Д)** 3, 4.

**7.** Закончыце народную прыказку: *Сябра за грошы ...*

**А)** не прадасі. **Б)** не купіш. **В)** не абмяняеш.
**Г)** не пазычыш. **Д)** не выкінеш.

**8.** Якія словазлучэнні ўтвораны правільна:

*1) хварэць грыпам; 2) мацней незнаёмца; 3) прабачыць сябра.*

**А)** усе словазлучэнні ўтвораны правільна.
**Б)** няма правільна ўтвораных словазлучэнняў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**9.** У якіх з прыведзеных слоў націск падае на другі склад:

*1) слабы; 2) эксперт; 3) уначы; 4) сантыметр; 5) наспех.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** 1, 3, 4. **В)** 2, 5. **Г)** 3, 4. **Д)** 4, 5.

**10.** Які знак прыпынку прапушчаны ў сказе:
*Напрадвесні і ў пушчы не многа красы _ толькі вецер шуміць на ўсе галасы ды сухая трава шамаціць каля ног ...* (Уладзімір Дубоўка)

**А)** няма знака прыпынку. **Б)** коска. **В)** працяжнік.
**Г)** двукроп'е. **Д)** кропка з коскай.

**11.** Выберыце з прыведзеных словы, у якіх на месцы пропуску неабходна напісаць літару ***ь***:

*1) рэдз..ка; 2) нян..чыць; 3) ц..мяны; 4) карэн..чык.*

**А)** усе словы. **Б)** усе словы, акрамя 4. **В)** 1, 3, 4. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**12.** Якія словы з прыведзеных маюць аднолькавую колькасць гукаў:

*1) сталіца; 2) вадзіца; 3) біятлон; 4) звініць.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 2, 3, 4.

**13.** Якім членам сказа з'яўляецца прыметнік у сказе: *Былі пагодныя дзянькі для касьбы.*

**А)** дзейнікам. **Б)** выказнікам. **В)** дапаўненнем.
**Г)** азначэннем. **Д)** акалічнасцю.

**14.** Выберыце з прыведзеных правільна напісаныя займеннікі:

*1) хто-небудзь; 2) абы хто; 3) абы з кім; 4) якомусьці.*

**А)** усе варыянты правільныя. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1, 2, 3. **Г)** 1, 3, 4. **Д)** 2, 3, 4.

**15.** Выберыце правільную схему пабудовы выказвання-разважання.

**А)** аргументы, вывад, тэзіс. **Б)** вывад, тэзіс, аргументы.
**В)** тэзіс, аргументы, вывад. **Г)** аргументы, тэзіс, вывад.
**Д)** тэзіс, вывад, аргументы.

**16.** Выберыце з прапанаваных выразы, якія абазначаюць лексічнае значэнне назоўніка ***студыя***: *1) майстэрня мастака або скульптара; 2) назва некаторых тэатральных калектываў; 3) школа для падрыхтоўкі мастакоў, скульптараў, артыстаў; 4) спецыяльнае памяшканне, адкуль вядуцца радыё- ці тэлевізійныя перадачы.*

**А)** усе выразы. **Б)** 1, 3. **В)** 1, 4. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**17.** Кароткі перапынак для адпачынку называецца …

**А)** адгода. **Б)** хада. **В)** аддышка. **Г)** вандроўка. **Д)** квіта.

**18.** Дадзены словы: *1) варатар; 2) дубкі; 3) зубчык; 4) прозьба.* У якім слове дапушчана памылка?

**А)** няма памылак. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**19.** У якіх словах замест кропак не напішаце літару ***т***:

*1) пачэс..ны абавязак; 2) пос..ная страва;*
*3) зайздрос..лівае вока; 4) кантэкс..нае значэнне; 5) карыс..лівы чалавек.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** ва ўсіх словах, акрамя 4. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 5. **Д)** 3, 4, 5.

**20.** Дадзены словы: *1) т..кстыль; 2) вад..віль; 3) банд..роль; 4) д..бют; 5) д..густацыя.* Дзе патрэбна напісаць літару **э**?

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** 1, 3, 5. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3, 4. **Д)** 3, 5.

**21.** Дапоўніце патрэбным прыметнікам вершаваны радок М. Багдановіча:

*Жыві і цэльнасці шукай,*
*Аб шырацe ... дбай.*

**А)** маральнай. **Б)** матэрыяльнай. **В)** духоўнай.
**Г)** неабдымнай. **Д)** навакольнай.

**22.** Хто з'яўляецца аўтарам верша "Смык"?

**А)** Цётка. **Б)** Эліза Ажэшка. **В)** Францішак Багушэвіч.
**Г)** Алесь Гарун. **Д)** Ядвігін Ш.

**23.** Аўтарам паэмы "Паляўнічыя акварэлькі з Палесся" з'яўляецца …

**А)** Кастусь Каліноўскі. **Б)** Янка Лучына. **В)** Адам Гурыновіч.
**Г)** Францішак Багушэвіч. **Д)** Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч.

**24.** Колькі назваў агародніны ў форме множнага ліку можна прачытаць у квадраце пры ўмове, што кожная наступная літара гэтай назвы знаходзіцца ў суседняй клетцы?

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| а | н | е | ч | а |
| л | г | о | н | с |
| с | ы | к | э | п |
| з | р | о | к | а |
| у | б | д | і | м |

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 3. **Г)** 5. **Д)** 6.